# АПЕКА РОДАЎ ПАЛУБІНСКІХ І САПЕГАЎ НАД ДАМІНІКАНСКІМ КЛЯШТАРАМ У ДЗЯРЭЧЫНЕ Ў XVII–XVIII ст.

**В. І. Захарыч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, valyazakharych@gmail.com*

Артыкул разглядае пытанне падтрымкі парафіяльнага дамініканскага касцёла ў Дзярэчыне ў XVII–XVIII ст. Праз уладальнікаў мястэчка Палубінскімі і Сапегамі паказваецца ўклад шляхецкіх родаў у развіццё касцёла і кляштара і ўплыў на яго далейшае функцыянаванне. Раскрываецца пытанне патранату над касцёлам і фарміраванне сямейнай традыцыі падтрымкі Дамініканскага ордэна на прыкладзе лакальнай гісторыі ўзаемадачыненняў маёмасных эліт паўднёва-заходняй Беларусі і Літоўскай правінцыі Ордэна ў ранні Новы час.

***Ключавыя словы:*** Палубінскія; Сапегі; Каталіцкая царква; Дамініканскі ордэн; Вялікае Княства Літоўскае.

# ОПЕКА РОДОВ ПОЛУБИНСКИХ И САПЕГ НАД ДОМИНИКАНСКИМ МОНАСТЫРЕМ В ДЕРЕЧИНЕ В XVII–XVIII в.

**В. И. Захарич**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, valyazakharych@gmail.com*

В статье рассматривается вопрос поддержки приходского доминиканского костела в Деречине в XVII–XVIII в. Через владельцев местечка Полубинскими и Сапегами показывается вклад шляхетских родов в развитие костела и монастыря и влияние на его дальнейшее функционирование. Раскрывается вопрос патроната над костелом и формирование семейной традиции поддержки Доминиканского ордена на примере локальной истории взаимоотношений имущественных элит юго-запада Беларуси и Литовской провинции Ордена в раннем Новом времени.

***Ключевые слова:*** Полубинские; Сапеги; Католическая церковь; Доминикаский орден; Великое Княжество Литовское.

# GUARDIANSHIP OF THE PALUBINSKI AND SAPEGA GENEALOGIES OVER THE DOMINICAN MONASTERY IN DZYARECHYN IN THE 17th–18th CENTURIES

**V. I. Zakharych**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, valyazakharych@gmail.com*

The article examines the issue of support for the parish Dominican church in Dzyarechyn in the 17th and 18th centuries. The contribution of noble families to the development of the church and the monastery and their influence on its further functioning is shown through the

owners of the town, the Palubinskis and Sapiegs. The issue of patronage over the church and the formation of a family tradition of supporting the Dominican Order is revealed using the example of the local history of the relations between the property elites of southwestern Belarus and the Order's Lithuanian province in the early modern times.

***Keywords:*** Palubinsky; Sapegs; Catholic Church; Dominican Order; Grand Duchy of Lithuania.

Апека над каталіцкімі цэнтрамі была распаўсюджанай практыкай у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ранняга Новага часу. Адной з праяваў такой апекі быў патранат. Гістарыяграфія мае некалькі вызначэнняў гэтага тэрміна, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад таго, да гісторыі якой канфесіі ён прымяняецца. У адносінах да Каталіцкай царквы існуе вызначэнне права патранату, якое ўскладвае на мецэната і яго нашчадкаў шэраг абавязкаў па ўтрыманні і адстойванні інтарэсаў царкоўнай адзінкі ў абмен на асабістыя прывілеі ад Царквы.

У дадзеным артыкуле пад патранатам будзе мецца на ўвазе дапамога царкоўнай адзінке на сталай аснове ў выглядзе касцёлу і кляштару манаскага ордэна пры ім з боку прадстаўнікоў маёмасных эліт. Патранат пачынаецца непасрэдна з фундацыі новай святыні і працягваецца адпаведным забеспячэннем касцёла неабходнымі сродкамі для яго паспяховага функцыянавання.

На лакальным ўзроўні асноўнымі патронамі над каталіцкімі аб'ектамі з'яўляліся маёмасныя эліты: для XIV–XV ст. ключавой асобай з'яўляўся манарх, для XVI ст. — магнаты, і для эпохі Рэфармацыі і Контррэфармацыі — шляхта. У XVII–XVIII ст. асобныя шляхецкія роды імкнуліся фінансаваць касцёльныя адзінкі ў сваіх маёнтках. Гэта бачна на уздыме фундацый кляштараў практычна ўсіх каталіцкіх манаскіх ордэнаў у Вялікім Княстве Літоўскім за акрэслены перыяд часу. Разглядзець апеку над касцёлам і кляштрам пры ім, якая падтрымлівалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне, магчыма на прыкладзе родаў Палубінскіх і Сапегаў у мястэчку Дзярэчын.

Дзярэчын з'яўляецца ўнікальным прыкладам, так як дзякуючы захаванасці дакументаў, элементы апекі над парафіяльным касцёлам і кляштарам Дамініканскага ордэна прасочваюцца у кожным пакаленні ўладальнікаў мястэчка. Храналагічныя межы XVII–XVIII ст. абумоўлены непасрэдна зменай уладальнікаў і палітычным кантэкстам. Крайнімі датамі з’яўляюцца 1609 г., калі Дзярэчын перайшоў да роду Палубінскіх, якія фундавалі касцёл і запрасілі Дамініканскі ордэн, і 1793 г., які звязаны са смерцю уладальніка мястэчка Аляксандра Міхала Сапегі і зменай палітычнай абстаноўкі ў сувязі з падзеламі Рэчы Паспалітай.

Права патранату ў Рэчы Паспалітай, яго значэнне і функцыянаванне на розных узроўнях, найбольш поўна ў сваім даследаванні прадставіў праф. Б. Шады [15]. З'яўленне і дзейнасць Дамініканскага ордэна непасрэдна ў Вялікім Княстве Літоўскім даследавалася шэрагам даследчыкаў, у першую чаргу прадстаўнікамі з польскай гістарыяграфіі [8; 10; 14]. Прыкладам работы па адлюстраванні дзейнасці права патраната над дамініканскім касцёлам і кляштарам з'яўляецца артыкул У. Врубеля [18]. Тэма апекі над касцёламі з боку шляхецкіх родаў ў Вялікім Княстве Літоўскім, і ў прыватнасці на беларускіх землях, застаецца не распрацаванай.

Даволі цікавым уяўляецца разгляд утварэння і функцыянавання касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштара Дамініканскага ордэна ў Дзярэчыне. Будучы адным з найстарэйшых кляштараў Ордэна, ён з'яўляецца прыкладам шляхецкага родавага патранату над царкоўнай адзінкай і яе функцыянавання на працягу 1618–1793 гг. з боку ўладальнікаў мястэчка ў справе падтрымкі адукацыйнай і прапаведніцкай дзейнасці дамініканцаў. Мястэчка Дзярэчын мае забяспечанасць дакументальнай і гістарыяграфічнай базай [2; 3; 4], аднак аспект, звязаны з родавай фінансавай царкоўнай палітыкай, патрабуе дадатковай увагі.

З'яўленне Дамініканскага ордэна ў Дзярэчыне звязана з родам Палубінскіх. У 1609 г. Дзярэчын быў выкуплены Аляксандрам Палубінскім. Як дапускае М. Каламайская-Саед, верагодна там ён фундаваў драўляны парафіяльны касцёл з далейшым намерам запрасіць ў мясцовасць Дамініканскі ордэн [12, с. 18]. Аднак вядома, што манахі-прапаведнікі з'явіліся ў Дзярэчыне дзякуючы сыну — Канстанціну Палубінскаму і яго-най жонке. Канстанцін Палубінскі (?–1640) ваенны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, у свой час атрымаў адукацыю ў езуітаў у калегіуме Браўнсбергу (Карлеўства Польскае) і Віленскай акадэміі і меў прыязныя адносіны з біскупствам Віленскім [10, s. 368]. Існуе меркаванне, што ён змяніў веравызнанне з праваслаўя на каталіцтва з нагоды жаніцьбы на Сафіі з Сапегаў (верагодна ў 1616 г.). Канстанцін Палубінскі ў 1616 г. звярнуўся да кіраўніцтва Польскай правінцыі Дамініканскага ордэна з намерам пакінуць сродкі на фундаванне дамініканскай пляцоўкі [5]. У 1618 г. фундацыя была здзейснена і пацверджана ў 1634 г. [18, с. 79]. Акрамя гэтага, кляштар быў абавязаны Палубінскаму фундацыяй шпіталя. У тастаменце 1637 г. апісваецца штогадовае ўтрыманне шпіталя на 50 польскіх злотых і 24 бочкі жыта і 8 бочак ячменя [12, с. 46]. Акрамя гэтага, Канстанцін і Сафія Палубінскія падаравалі кляштару два свае фальваркі — Старое Сяло і Падзолле, сем валокаў лесу, возера, млын і зямлю пад кляштарны агарод [12, с. 41]. З дадзеных фальваркаў дамініканцы ўтрымліваліся да падзелаў Рэчы Паспалітай, дзе на канец XVIII ст. з іх яны валодалі 45 дымамі і прыбыткам у 7659 злотых [8].

Фундацыю падтрымалі далёкія родзічы Канстанціна Палубінскага — вядомы запіс 1620 г. ад Міхаіла Палубінскага на лес Валоба, а ў 1627 г. ад Станіслава Палубінскага даміціканцы атрымалі 4 валокі зямлі і сенажаць над р. Зэльва [12, s. 45]. Дамінікнскі касцёл і кляштар у мястэчку ўтварылі свой кляштарны комплекс, уключаючы сакральныя, жыллёвыя і гаспадарчыя пабудовы.

Для Дамініканскага ордэна дадзенная фундацыя ў Дзярэчыне (як і ў Астраўцы ў тым жа 1618 г.) стала працягам палітыкі па павелічэнні колькасці цэнтраў Віленскай кантраты (структурнай адзінкі Польскай правінцыі). Такая палітыка праводзілася ў мэтах ўмацавання і адасаблення кантраты ад Польскай правінцыі з ўтварэннем Літоўскай правінцыі, што ўдалося канчаткова рэалізаваць у 1647 г.

Справу бацькі працягнуў ягоны сын Аляксандр Гіларый Палубінскі (1627–1679). Ён быў адпачатку ахрышчаны ў каталіцтва і актыўна падтрымліваў манастырскія асяродкі, на што ўказваюць падараванні ад яго касцёлам і кляштарам шэрагу манаскіх ордэнаў (напр. бернардынцы ў Глуску, езуіты ў Вільні). Гісторыкі адзначаюць яго прыязнасць да ўніятаў і праваслаўных, прыводзячы ў прыклад падтрымку храмаў для сваіх падданых [11, с. 480].

Безумоўна, Ордэн дамініканцаў у сваім галоўным маёнтку ў Дзярэчыне не застаўся без увагі. Пры Аляксандры Гіларыі Палубінскім касцёл і кляштар узмацніўся, нягледзячы на складаны ў палітычным плане час. Падчас ваенных дзеянняў у 1654–1667 гг. маёнтак Дзярэчын страціў колькасць дымоў на 47 %, знаходзіўся некалькі год пад закладам, мястэчка пацярпела ад пажару 1660 г. [3, с. 122–125]. Нягледзячы на дадзеныя ўмовы, кляштар не пацярпеў і бесперапынна працягваў сваю дзейнасць. З Вільні ў Дзярэчын была перанесена галоўная правінцыйная навучальная ўстанова — генеральная студыя, якая дзейнічала тут у 1658–1664 гг. [14, с. 214]. Таксама ў Дзярэчыне ў 1656, 1658, 1674 гг. праводзіліся пасяджэнні правінцыйных капітул Ордэна. Такая адказная дзейнасць патрабавала адпаведных сродкаў.

Меркавана, пры Аляксандры Гіларыі былі закладзены ўстановы адукацыі, што ў далейшым прывяло да ўспрымання Дзярэчына як аднаго з важных цэнтраў падрыхтоўкі манахаў Ордэна ў Літоўскай правінцыі. Так, кляштар здабыў права на ўтрыманне ўласнага навіцыяту для падрыхтоўкі будучых манахаў у 1669 г. Хутчэй за ўсё, у 60-я – 70-я гг. XVII ст. праз спансаванне апекуна з’явілася і філасофская студыя для дамініканцаў. Акрамя гэтага, з фундацыі Аляксандра Гіларыя ў дамініканскім касцёле была ўтворана капліца Анёлаў-ахоўнікаў.

Пра цесную сувязь А. Г. Палубінскага і Дамініканскага ордэна дадаткова сведчыць супрацоўніцтва з правінцыялам Літоўскай правінцыі Ордэна Міхалам Вайніловічам, які дапамагаў Палубінскаму ў афармленні генеалагічнага дрэва роду. Аляксандр Гіларый Палубінскі, згодна з тастаментам, быў сціпла пахаваны ў дамініканскім адзенні ў дзярэчынскім касцёле. На казанні на смерць той жа правінцыял Ордэна называў Палубінскага «яснавяльможным дабрадзеем і фундатарам» і адзначаў яго заслугі перад Айчынай і Касцёлам [19].

Сярод родных, да падтрымкі дамініканскага цэнтра далучылася і сястра Аляксандра Палубінскага — Хрысціна з Палубінскіх Каменская, якая ў 1673 г. перадала некалькі дзясяткаў жывёл, бочку солі і два дываны [2, с. 13].

Крыштаф Канстанцін Палубінскі, сын Аляксандра Гіларыя, непасрэдны спадкаемца Дзярэчына, стаў апошнім прадстаўніком галіны роду, памёр у 1685 г.

Такім чынам, дзякуючы роду Палубінскіх, ў мястэчку Дзярэчын з'явіўся парафіяльны касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштар Ордэна дамініканцаў. Яны матэрыяльна забяспечылі існаваннне манаскай адзінкі, менавіта дзякуючы ім яна атрымала сваё ўвасабленне і функцыянал. Пры патранаце шляхецкага роду, дзейнасць дамініканскага цэнтра змагла быць накіраванай на знешні і ўнутраны вектары. Праяўленні знешняга вектару бачныя ў працы з насельніцтвам, што выяўлялася ў забеспячэнні рэлігійных патрэбаў пад час душпастырскай і прапаведніцкай дзейнасці, абарону здароўя ў функцыянаванні шпіталя. З развіццём ўнутранага вектару, Дамініканскі ордэн ўмацоўваў пазіцыі кляштара, займаўся падрыхтоўкай унутраных кадраў на застанаваных тут жа студыях, наладжваў уласнае забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці на атрыманых уладаннях.

У 1685 г. Дзярэчын перайшоў да сястры Крыштафа Канстанціна Ізабэлы Алены з Палубінскіх у якасці пасагу на шлюб з Юрыем Станіславам Сапегай. Такім чынам, яна перадала Дзярэчын ружанскай галіне роду Сапегаў [1, с. 486].

Неабходна адзначыць, што бацькамі Юрыя Станіслава Сапегі былі Казімір Ян Сапега і Крысціна з Глябовічаў. Яны ў свой час вядомыя запрашэннем Ордэна дамініканцаў у Заслаўе і Пескі. А дзед — Павел Ян Сапега — з'яўляўся фундатарам дамініканскага касцёла ў Беліцы [13, с. 130–132]. Такім чынам, магчыма казаць пра спалучэнне апекі па сямейнай традыцыі з патранажам над касцёлам па праву валодання мястэчкам.

Пры змене ўладальнікаў Дзярэчына, манахі-дамініканцы атрымалі пацвярджэнне ўсіх наданняў, а таксама атрымалі новыя запісы. Да 1690 г. быў касцёл перабудаваны ў мураваны. Працягвалася развіццё адукацыі, з

ў 1685 г. у студыі на сталым ўзроўні сталі выкладаць тэалогію, а ў 1697 г. установа была рэарганізавана ў фармальную студыю ўніверсітэцкага ўзроўня [14, с. 232].

Наступнай важнай асобай у якасці апекуна для дамініканцаў стаў сын Юрыя Станіслава Сапегі — Антоні-Казімір Сапега, уладальнік Дзярэчына пасля смерці Ізабэлы Алены з Палубінскіх у 1720–1739 гг., мерацкі стараста. Ён быў прыхільны мясцовым манахам, спансаваў фрэскі ў кляштары, дзве капліцы ў касцёле (Св. Антонія і Св. Вінцэнта), і ў выніку быў пахаваны ў тым жа храме [1, с. 342]. Астатнія ўладальнікі Дзярэчына былі пахаваныя ў кляштары картэзіянцаў у Бярозе.

Стрыечны брат Антонія Казіміра — Міхаіл Антоні Сапега — стаў наступным уладаром Дзярэчына і адпаведна апекуном дамініканскага касцёла. Аб яго цеснай сувязі з Дзярэчынам і Ордэнам кажуць словы з успамінаў дамініканца, доктара тэалогіі Войцэха Вінцэнта Яна Канты Багінскага. Манах пад час патранату М. А. Сапегі атрымліваў адукацыю ў філасофскай студыі ў Дзярэчыне. Ён пакінуў пасля сябе ўспаміны, дзе адзначаў найбольш важныя здарэнні ў гісторыі Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай, Літоўскай правінцыі Ордэна. У іх К. Багінскі пакінуў заметку з нагоды смерці Сапегі, назваўшы яго «асаблівым дабрадзеем Дзярэчына, а ўсёй дамініканскай правіцыі добрым сябрам» [16, с. 32].

Пры М. А. Сапеге скончылася рэстаўрацыя касцёла пасля пажару 1717 г., быў пастаўлены алтар, наняты людзі для ўсталявання ўнутраных дэкарацый і роспісаў, было ахвяравана літургічнае начынне з Варшавы. Міхаіл Антоні таксама рамантаваў адну з капліц для размяшчэння ў ёй уласнай бібліятэкі і архіва [12, с. 20]. За ўладаннем Міхаіла Антонія Сапегі ў Дзярэчыне ў 1755 г. праводзіў місію знакаміты дамініканец, прапаведнік Ваўжынец Аўлачымскі [6].

Цікава, што Дзярэчын у XVIII ст. перыядычна знаходзіўся ў закладах з-за фінансавых праблем Сапегаў, і ў 1750 г. быў у закладзе ў віленскіх дамініканцаў за 25 тыс. злотых [1, с. 486]. Але мястэчка заўсёды выкупалася і вярталася ў рукі Сапегаў, і такія перамены не адбіліся на становішчы манахаў-дамініканцаў ў Дзярэчыне.

Пазней уладальнікамі Дзярэчына былі Міхал Ксаверы Сапега ў перыяд 1760–1766 гг., яго брат Аляксандр Міхал Сапега ў 1766–1793 гг. Аднак на дадзены момант падрабязна апісаць іх унёсак у развіццё кляштару не ўдаецца магчымым.

Дзякуючы роду Сапегаў дамініканцы змаглі захаваць сваю спадчыну і ўзбагаціць яе. Магнаты ўклаліся ў ліквідацыю наступстваў пажара, у адбудову касцёла і афармленне яго інтэр’ера.

Цягам XVIII ст. дзярэчынскі кляштарны комплекс магчыма было назваць адной са славутасцяў рэгіёна. Гэта быў цэнтр парафіі, які змяшчаўся ў багата аздобленым касцёле, у якім знаходзіліся абразы Унебаўзяцця Марыі і Укрыжаванага Езуса з вотамі. Вядома таксама, што касцёл меў сваё рэлігійнае брацтва. Існаваў даволі вялікі па колькасці манахаў кляштар (там жыло і навучалася каля 30-ці чалавек) з рознаўзроўневымі ўстановамі адукацыі, якія былі забяспечаныя ўласнай бібліятэкай (узгаданыя навіцыят і студыі для манахаў, а таксама ўтрымаемая за кошт манахаў парафіяльная школа для моладзі).

Такім чынам, на хвалі контррэфармацыйнага руху шляхецкі род Палубінскіх заснаваў парафіяльны касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі і дамініканскі кляштар пры ім. Царкоўныя ўстановы разам утварылі кляштарны комплекс. Апека над ім перадавалася з пакалення ў пакаленне дзякуючы праву патраната. Найбольш вагомым і заўважным укладам у межах партанату было вырашэнне эканамічных пытанняў. Прадстаўнікі роду матэрыяльна забяспечвалі існаваннне касцёла і кляштара, надалі неабходную маёмасць і фінансаванне, што дазволіла бесперапынны працяг функцыянавання манаскіх устаноў. Род Сапегаў, у сваю чаргу, працягнуў уласную сямейную традыцыю падтрымкі Дамініканскага ордэна, атрымаўшы ва ўладанне Дзярэчын. Ён спрыяў узмацненню комплекса і яго мастацкага афармлення. Дзякуючы патранату з боку Палубінскіх і Сапегаў, Дамініканскі ордэн забяспечваў правядзенне душпастырскай, місіянерскай, адукацыйнай, дабрачыннай, эстэтычнай дзейнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Гісторыя Сапегаў: жыццяпісы, маёнткі, фундацыі. Мінск : Выд. Віктар Хурсік, 2017.
2. *Скобла М.* Дзярэчынскі дыярыюш. Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999.
3. *Сліж Н.* Маёнтак Дзярэчын на падставе інвентара 1663 г. // Архіварыус. 2018. Вып. 16. С. 122–147.
4. *Соркіна І.* Мястэчкі Зэльва і Дзярэчын у святле архіўных звестак // Славуты Зэльвенскі край : матэрыялы навук. гісторыкакраязн. канф. Ліда, 2004. С. 87–97.
5. Archiwum Polskiej Prowincji Dominikanów. Jednostka Archiwum Polskiej Prowincji. Pp 701.
6. *Brzozecki S.* Misje ludowe dominikanów prowincji litewskiej 1751–1826. Lublin: Oficyna Wydawnicza el-Press s. c., 2007.
7. Dominikanie na ziemiach polskich w epoce nowożytnej / red. A. Markiewicz i M. Miławiecki OP. Kraków, 2009.
8. Duomenys apie fundacijas domininkonų vienuolynams // Vilniaus universiteto biblioteka. F5-A23-4329. I. 1. [Электронны рэсурс]. URL: https://kolekcijos.biblioteka.vu.lt/objects/VUB01_0006648 60#00001 (дата звароту 17.07.2024).

9. *Gwiazda H.* Fundacje i fundatorzy klasztorów dominikańskich w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1648–1696 // Studia nad historią dominikanów w Polsce 1222–1972. T. 1. S. 607–645.

10. *Lulewicz H.* Polubiński Konstanty // Polski Słownik Biograficzny. T. XXVII. S. 368–369.

11. *Majewski A.* Aleksander Hilary Połubiński (1626–1679), marszałek wielki litewski: działalność polityczno-wojskowa. Warszawa: Neriton, 2017.

12. Materiały do dziejów sztuki sakralnej na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej: w 5 cz. Cz. 2, T. 4. Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa nowogródzkiego / red. Maria Kałamajska-Saeed. Kraków: Miedzynarodowe Centrum Kultury, 2014.

13. *Miławicki M.* Dominikanie na kresach wschodnich Rzeczypospolitej Obojga Narodyw (teren dzisiejszej Biaiorusi) // Folia Historica Cracoviensia. Krakow: Dominikacski Instytut Historyczny w Krakowie, 2014. T. 20. S. 95–153.

14. *Świętochowski R.* Szkolnictwo teologiczne dominikanów // Dzieje teologii katolickiej w Polsce. T. 2. Cz. 2. / pod red. Mariana Rechowicza. Lublin : Wydawnictwo Towarzystwa Naukowego Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 1975. S. 213–285.

15. *Szady B.* Prawo patronatu w Rzeczypospolitej w czasach nowożytnych. Lublin: Wydawnictwo-Drukarnia Liber, 2003.

16. *Tyszkiewicz E.* Rękopism x. Baginskiego Dominikana Prowincyi Litewskiej [Электронны рэсурс] // Wielkopolska Biblioteka Cyfrowa. URL: https://www.wbc.poznan.pl/dlibra/publication/528222/edition/515312 (дата звароту 17.07.2024).

17. *Wróbel W.* Opieka patronacka rodów Paców i Branickich nad klasztorem dominikanów w Choroszczy // Parafia rzymskokatolicka w Choroszczy. 550 lat. Księga jubileuszowa / red. ks. T. Kasabuła, ks. A. Szot. Białystok, 2009. S. 123–134.

18. *Wołyniak (Giżycki J. M.).* Wiadomości o dominikanach prowincyi litewskiej. Cz. I. Kraków, 1917.

19. *Woyniłowicz M.* Naynizszy z naywyzszego Iasnie Wielmożny Iego M. Pan Alexander Hilary Połubinski marszałek naywyzszy W. X. L. … [Электронны рэсурс] // ePaveldas. Skaitmeninto kultūros paveldo portalas. URL: https://www.epaveldas.lt/preview?id=C1B0001058041 (дата звароту 17.07.2024).